# РЭЙТЫНГАВАЯ С1СТЭМА ЯКАСНАЙ АЦЭНК1 ДЗЕЙНАСЦ1 СТУДЭНТАУ ФАКУЛЬТЭТА Ф131ЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Старчанка У.М.
УА "ГДУ 1мя Ф. Скарыны"

З 1 студзеня 2008 года на факультэце фізічнай культуры УА ГДУ Імя Ф. Скарыны ўведзена рэйтынгавая сістэма якаснай ацэкі дзейнасці студэнтаў.

Рэйтынгавая сістэма прызначана для абагульненай якаснай ацэнкі дзейнасці студэнтаў і разлічваецца з улікам іх вучэбных, навуковых, сацыяльных і спартыўных дасягненняў. Рэйтынгавая сістэма прызвана стымуляваць вучэбную і сацыяльную актыўнасць студэнтаў, што можа спрыяць павышэнню якасці падрыхтоукі спецыялістаў з вышэйшай фізкульгурнай адукацыяй.

Прадметам кантролю (намшацыям) у рэйтынгавай сістэме вызначаны:

- уключанасць у вучэбную дзейнасць (наведванне вучэбных заняткаў);
- паспяховасць вучэбнай дзейнасці;
- навукова-даследчая работа;
- сацыяльная актыўнасць;
- спартыўныя дасягненні

Пры вызначэнні рэйтынгавай пазіцыі студэнтаў выкарыстоўваецца адмысловая методыка.

Пры ацэньванні кожнага з прадметаў кантролю студэнтам з выкарыстаннем прыведзеных ніжэй крытэрыяў налічваецца пэўная колькасць балаў, пасля чаго студэнты ранжыруюцца ў адпаведнасці з колькасцю набраных балаў і атрымліваюць адпаведныя рангі ў кожнай з пяці намінацый. Абагульнёны ранг студэнта вызначаецца як медыяна яго рангаў у названых намінацыях. У адпаведнасці са значэннем медыяныя студэнты зноў ранжыруюцца і атрымліваюць абагульнёны (вышковы) ранг у групе (на курсе).

У плане арганізацыі рэйтынгавая сістэма дзейнічае наступным чынам.

Па выніках кожнай сесіі куратары вучэбных груп запаўняюць групавыя пратаколы (табліца 1). Пры запаўненні групавога пратаколу куратар мусіць прытрымлівацца наступных крытэрыяў:

— Пры вымярэнні **наведвання вучэбных заняткаў** крытэрыем з'яўляецца колькасць прапушчаных гадзін заняткаў за семестр.

— Прыклад: студэнт прапусціў за семестр 32 гадзіны заняткаў. У графу наведванне прастаўляецца лік 32.

— Пры вымярэнні **паспяховасці** бал студэнта вызначаецца як медыяна атрыманы на апошняй сесіі адзнак. (Медыяна - гэта цэнтральны элемент упарадкаванай выбарю).

Прыклад 1: студэнт атрымаў падчас сесіі адзнакі: 5, 7, 8, 6, 5. Упарадкуем выбарку: 5, 5, 6,7, 8. Медыяна = 6.

Прыклад 2: студэнт атрымаў падчас сесіі адзнакі: 5, 6, 8, 5. Упарадкуем выбарку: 5, **5, 6,** 8 . Медыяна = **5,5.** [(5+6):2 = **5,5].**

— Пры вымярэнні дасягненняў у навукова-даследчай рабоце балы налічваюцца за ўдзел у рабоце навуковых гурткоў (1 бал), выступы на навуковых канферэнцыях (2 балы), публікацы (3 балы).

— Прыклад: студэнт у справаздачным семестры наведваў навуковы гурток (1 бал) і апублікаваў навуковую працу (3 балы), што дало яму у залік 4 балы.

— Пры вымярэнні сацыяльнай актыўнасці балы налічваюцца за ўдзел у рабоце грамадскіх арганізацый (1 бал), выкананне грамадскіх абавязкаў (2 балы), публікацыі у СМІ (у тым ліку газеце "Гомельскі універсітэт" (3 балы), выступленне на канцэртах і конкурсах самадзейнасці (2 балы), суботніках, рэйдах і іншых мерапрыемствах (2 балы).

Прыклад: студэнт у справаздачным семестры выконваў абавязкі старасты групы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

(2 балы), выступіў на конкурсе "А ну-ка, першакурснік" (2 балы), што дало яму ў залік 4 балы.

— Пры вымярэнні спартыўных дасягненняў балы налічваюцца за выступленне на спаборніцтвах з улікам паказанага на працягу семестра спартыўнага разраду:

МСМК - 10 балаў; МС - 8 балаў; КМС - 6 балаў; 1 р-д - 5 балаў; 2 р-д - 4 балы; 3 р-д - 3 балы; юн. р-д - 2 балы; без разраду - 1 бал; не выступаў - 0 балаў.

Прыклад: студэнт у справаздачным семестры прыняў удзел у двух спаборніцтвах, на адным з дзвюх паказаў вынік адпаведны 2-му спартыўнаму разраду, што прынесла яму 4 балы.

Групавы пратакол рэйтынгавай сістэмы запаўняецца куратарамі груп і перадаецца для камп'ютарнай апрацоўкі. Камп'ютарная апрацоўка групавых пратаколаў ажыццяўляецца з дапамогай камп'ютарнай праграмы «Рэйтынгавая сістэма» (зробленай у праграмным асяродку Exel) (табліца 2) пад упраўніцтвам дацэнта У.М. Старчанкі.

Рэйтынгі студэнтаў вызначаюцца ў межах кожнага курсу (але не группы) з тым, каб пазбегнуць канкурэнцыі паміж куратарамі і зменшыць верагоднасць прыпісак. У перспектыве плануецца адсочваць дынаміку рэйтынгу студэнтаў на працягу ўсяго працэса навучання на факультэце.

Вышковыя рэйтынгавыя табліцы (асобна па кожнаму курсу) вывешваюцца на спецыяльным стэндзе дэканата факультэта. З улікам занятага студэнтамі рэйтынгу дэканат прымае рашэнне аб іх заахвочванні.

Табліца 1 - Фрагмент групавога пратаколу

| Групавы пратакол рэйтынгавай сістэмы. Факультэт фізічнай культуры Група _________ Семестр _______ 200_ - 200_ н.г. | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № пп | Прозвішча | Наведванне заняткаў | Паспяховасць | НДРС | Сад. актыўнасць | Спарт. дасягненні |
| | | *Бал* | *Бал* | *Бал* | *Бал* | *Бал* |
| *1* | | | | | | |
| *2* | | | | | | |
| *3* | | | | | | |
| *4* | | | | | | |
| Куратар групы | | | | | | |

Табліца 2 - Фрагмент электроннай табліцы *Exel* для вывучэння рангаў студэнтаў

| Рэйтынг студэнтаў фак-та фізічнай культуры. K>jv 1 Г руны 1 3. 1007-200X111 lceuccip. | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № пп | Прозвішча | Наведванне | | Паспяховасць | | ПДРС | | Сац. JKibfV-HJLUL | | Спарт. дасягненні | | - | Аплып ы ранг |
| | | *На 1* | Pain | *hen* | Ранг | *Бал!* | Ршп | *Ъеи* | Ран і | *Беи* | Раш | N | |
| | Аляксейчык | 3 | 24 | 8 | 13 | 0 | | 2 | 15 | 0 | 16 | | **21** |
| | Чысцічава | "52 | 62 | 7 | 34 | 0 | 7 | 2 | | 0 | 16 | io | **3 0** |
| | Влірава | 17 | 47 | 7 | 34 - | 0 | >7 | 0 | 47 | 0 | 16 | | **Ml** |
| | »* | **и > •** | > ^ « | * * * | >• ' | * * * | * * * | * * * | | * * * | | | * * * |
| | Юрчанка | 14 | ^ 44 | 8 | *и* | 0 | 7 | 1 | 34 - | 0 | -1б | 16 | **3 0** |

Апісаная вышэй рэйтынгавая сітэма з'яуляецца метралагічна карэктнай і паспяхова апрабавана на 1-м курсе факультэта фізічнай культуры УА ГДУ Імя Ф. Скарыны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ